«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Першатравеньскі мітынг у Мінску: затрыманыя паплечнікі Міколы Статкевіча і анархісты фота відэа дапоўнена

01.05.2018 **Тэгі**: акцыі, затрыманні



Першамайскі мітынг у Кіеўскім скверу.

У Мінску 1 траўня прайшоў дазволены Менгарвыканкам мітынг у абарону правоў працоўных і супраць дэкрэту «Аб садзейнічаньні занятасці насельніцтва». Паводле заяўкі, у акцыі могуць прыняць удзел да 2 тысяч чалавек.

Па словах старшыні Беларускага прафсаюза работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці **Генадзя Фядыніча**, ў заяўцы рэпаўцы прапанавалі тры магчымыя месцы правядзення акцыі – пляцоўка каля

Опернага тэатру, сквер Янкі Купалы і Кіеўскі сквер.

> *- Заяўка, як і ў мінулым годзе, падавалася ад Беларускага кангрэсу незалежных прафсаюзаў. У адрозненне ад мінулага года, правядзенне дазволілі: з трох заяўленых пляцовак - каля тэатра оперы і балета, у скверы Янкі Купалы і ў Кіеўскім скверы, улады ў выніку выбралі Кіеўскі сквер – відавочна, гэта для іх прасцей, бо гэтую пляцоўку і раней дазвалялі,* – паведаміў сайту praca-by.info Генадзь Фядыніч.

Мітынг адбудзецца 1 траўня ў Кіеўскім скверы сталіцы з 14 да 16 гадзін.

***

На першатравенскіх акцыях у Менску затрыманыя пяцёра паплечнікаў Міколы Статкевіча. Яны знаходзяцца ў Цэнтральным РУУС Мінска і пагражаюць абвясціць галадоўку, калі іх прысудзяць да арышту. Гэтую інфармацыю падцвердзіў Радыё Свабода лідэр «Народнай Грамады» **Мікола Статкевіч.**

Яны далучыліся да афіцыйнага мітынгу дзяржаўных прафсаюзаў ФПБ, які праводзіцца ў парку Перамогі.



Затрыманыя генеральны сакратар «Народнай Грамады» **Сяргей Спарыш**, кіраўнік гаркама **Валянцін Троцкі** і **Рыгор Пагарцаў**, а таксама **Андрэй Шыпулін.** Сярод затрыманых - **Сяргей Тарасенка**, які здымаў пікет. Яны знаходзяцца пад наглядам супрацоўнікаў міліцыі. Паводле Статкевіча, яшчэ напярэдадні яны абвясцілі, што калі іх прысудзяць да арышту за акцыю на 1 траўня, то яны абвясцяць галадоўку. Усе яны ў Цэнтральным РУУСе, пасля складання пратаколаў павязуць у ІЧУ на Акрэсціна да суда.

У першай палове дня супрацоўнікі міліцыі таксама затрымалі актывістаў «Еўрапейская Беларусь», якія заяўлялі аб удзеле ў першамайскім мітынгу. У прыватнасці, вядома пра затрыманне перад пачаткам мітынгу **Яўгена Афнагеля.** Праз некаторы час ён быў вызвалены без складання пратаколу правапарушэння.



Падчас мерапрыемства некалькі чалавек запалілі фаеры і расцягнулі расцяжку. Кіраўніцтва МУС адразу ж папярэдзілі пра адказнасць у выглядзе арт 23.34 КаАП РБ, - паведамляе control_by. Іх таксама папярэдзілі арганізатары мітынгу і забаранілі выступаць.



Стала вядома аб затрыманні некалькіх чалавек, якія расцягнулі расцяжку "Свабода, роўнасць, самакіраванне". Калі анархісты сыходзілі з акцыі -супрацоўнікі міліцыі затрымалі траіх актывістаў анархісцкага руху. Вядома, што сярод іх і **Вячаслаў Касінераў**. Іх лёс высвятляецца...


Відэа затрымання можна знайсці на старонцы "Вясны" ў фэйсбуку.

Мітынг завершаны. У ім бралі ўдзел кіраўнікі БКДП **Аляксандр Ярашук** і прафсаюза РЭП **Генадзь Фядыніч**, сустаршыня незарэгістраванага Беларускага нацыянальнага кангрэса Мікалай Статкевіч і кіраўнікі партыі "Справядлівы Свет". Найбольшая колькасць удзельнікаў - каля 130 чалавек.

Опубликовать








Паказваў "Вікторыю" на Маршы. Мужчыну асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі" па "народным" артыкуле

Двух сябровак асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Мужа і жонку Каражан асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту

У рэгіёнах Міншчыны праводзяць пікеты ў "падтрымку выбараў". Разбіраемся, што з імі не так




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"У мяне не было магчымасці супраціўляцца інакш". Маналогі затрыманых на антываенных акцыях два гады таму


"Турмы ў турме": захаванне правоў зняволеных ў ізалятарах, карцарах і ПКТ — праблемы і выклікі

"У ПК-1 палітвязняў прымушаюць закапваць будаўнічае смецце і спальваць адкіды". Былы вязень указаў месцы на мапе

Запрашаем на канферэнцыю! Штрафны ізалятар, карцар, ПКТ: інструмент выпраўлення ці знявагі?







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Выбары*2024. Папярэдняя аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі дэпутатаў у адзіны дзень галасавання 25 лютага 2024 года (дакумент)

"Разгубленасць і бездапаможнасць". Што распавядаюць былыя палітвязні пра фатаграфаванне ў калоніях (фота)

Метамарфозы суда: дальнабойшчыка абвінавачвалі за падрыў петарды, але асудзілі за ўдзел у экстрэмісцкім фармаванні

Мінімум 12 затрыманых: што вядома пра рэйд КДБ на адвакатаў

Заява аб прызнанні Васіля Палякова палітычным зняволеным

Заява аб прызнанні сямі чалавек палітычнымі зняволенымі

Бацьку траіх дзяцей асудзілі да года калоніі за каментары ў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Студзень 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА





















СЯБРОЎСТВА







#BYSOL

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

